тант Плюс: Беларусь [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2007.

О предприятиях: Закон Респ. Беларусь, № 462-XII от 14.12. 1990 г.: утратил силу Законом № 307-З от 30.07. 2004 г. // Консультант Плюс: Беларусь [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2004.

О противодействии монополистической деятельности и развитии конкуренции: Закон Респ. Беларусь № 2034-XII от 10.12.1992 г.: в ред. Закон Респ. Беларусь № 328-З от 22.12. 2011 г. // Консультант Плюс: Беларусь [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.

*Статья поступила*
*в редакцию 01.06. 2012 г.*

**А.А. ГУР'ЕВА**

# *УТВАРЭННЕ І РАЗВІЦЦЁ АДВАКАТУРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ДА ПРЫНЯЦЦЯ СТАТУТА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1529 г.*

Адвакатура налічвае ўжо шмат стагоддзяў існавання і належыць да ліку найстаражытных працэсуальна-прававых інстытутаў. Вывучэнне гісторыі ўзнікнення і развіцця інстытута адвакатуры ва Усходняй Еўропе, у тым ліку на Беларусі, ажыццяўлялася як айчыннымі навукоўцамі, так і навукоўцамі з суседніх краін. Так, праблему зараджэння і дзейнасці інстытута адвакатуры закраналі вучоныя дарэвалюцыйнага перыяду (К. Малышаў [1, *207*], М. К. Любаўскі [2], Д.Н. Барадзін [3, *51*] і інш.). Размова ў іх працах ішла пра этапы зараджэння асобных форм інстытута адвакатуры, іх узаемасувязь і, як вынік, утварэнне інстытута прафесійнай адвакатуры.

Цікавым з'яўляецца і даследаванне М.В. Доўнар-Запольскага, які заўважае, што развіццё навукі права Беларусі добра праследжваецца на прыкладзе яскравых адвакацкіх прамоў [4].

Нажаль у савецкі перыяд пытанне развіцця інстытута адвакатуры амаль не закраналася. Да і на сённяшні дзень на Беларусі гэта праблема даследавана недастаткова, яе вывучэнне зводзіцца ў асноўным толькі да Ю.П. Доўнар [5, *90—95*; 6,*116—118, 125*]. Другія беларускія вычоныя разглядалі гэта пытанне толькі ў рамках іншых гістарычна-прававых праблем.

Нельга не дадаць, што украінскія [7, *113*], польскія [8] вучоныя пры даследаванні гісторыі айчыннага права, і ў прыватнасці судовага ладу, закранаюць аналагічныя пытанні адносна Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ).

Нягледзячы на тое што ў сучасным разуменні прафесійны інстытут адвакатуры аформіўся ў Беларусі адносна нядаўна — у XIX ст., яе асобныя формы вядомы яшчэ са старажытных часоў і праяўляліся ў выглядзе прадстаўніцтва і правазаступніцтва.

Развіццё працэсуальнага права Беларусі ў перыяд утварэння першых беларускіх княстваў насіла сходны з іншымі ўсходнеславянскімі народамі характар, бо існавала агульнасць сацыяльна-эканамічнага і палітыка-прававога развіцця, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі і асноўныя помнікі права старажытнай Русі. Спачатку ў вельмі прымітыўным выглядзе, як адна з функцый адвакацкай дзейнасці, з'яўляецца ідэя прадстаўніцт-

*Алена Аляксандраўна ГУР'ЕВА, аспірантка кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.*

ва бакоў перад судом. Першапачаткова ў судаводстве дзейнічаў прынцып «асабістай яўкі». Суды не былі прафесійнымі і пастаянна дзеючымі органамі ўлады, а склікаліся па меры неабходнасці. Разгляд суда быў публічнай справай усяго народа, таму асабістая яўка ў суд для абедзвюх бакоў была адным з самых святых грамадзянскіх абавязкаў, што не спрыяла ўзнікненню прафесійнага інстытута судовага прадстаўніцтва. Палажэнні аб прадстаўніцтве рэгуляваліся звычаямі пэўнай мясцовасці і датычыліся, у асноўным, асоб з абмежаванай дзеяздольнасцю — пажылых людзей, жанчын, дзяцей. Прадстаўнікамі, як правіла, былі іх сваякі — мела месца так званае натуральнае прадстаўніцтва.

Шматлікія даследчыкі разыходзяцца ў вызначэнні перыяду з'яўлення прадстаўніцтва ў старажытных усходніх славянаў. Так, па меркаванні Д.Н. Барадзіна [3, *51*] і У.І. Баженавай [9, *22*] першыя згадванні аб судовым прадстаўніцтве сустракаюцца ў Рускай Праўдзе. У раздзеле «О поклепной вире» узгадвалася аб тым, што «мечник» (абвінаваўца, вартавы закона) уяўляў сабой зацікаўленную асобу ў абвінавачванні і атрымліваў «гривну» за даказанае злачынства, тады як «детский» — прадстаўнік інтарэсаў абароны — атрымліваў «кун сметная», калі абвінавачванне было «сметено» (аспрэчана): «а железного платили 40 кун, а мечнику 5 кун, а полгривны детскому: то ти железный урок, кто си в чем емлет» [9, *22*].

Іншыя даследчыкі, у прыватнасці Е.У. Васькоўскі, лічылі што такія найстаражытныя помнікі, як, напрыклад, міжнародныя дагаворы з грэкамі і Руская Праўда, абсалютна маўчаць аб судовым прадстаўніцтве [10, *20*], а ўпершыню аб судовым прадстаўніцтве на Русі згадвалася ў заканадаўчых зборніках XV ст., а менавіта ў Пскоўскай і Наўгародскай судных граматах.

Адносна Беларусі існуе меркаванне, што з'яўленне адвакатуры на нашых землях звязана са статутным правам (Статуты 1529, 1566, 1588 гг.) [5, *90—95*].

На наш погляд, на тэрыторыі Беларусі прафесійнае (наёмнае) прадстаўніцтва (першая гістарычная састаўляючая адвакацкай дзейнасці), крытэрыямі якога з'яўляліся платнасць паслуг і іх аказанне розным асобам (а не толькі сваякам, як напрыклад у «натуральным прадстаўніцтве», вядома яшчэ ў дастатутны перыяд і звязана з утварэннем Вялікага княства Літоўскага, дзе функцыі прадстаўнікоў паступова пераходзяць ад натуральных прадстаўнікоў да наёмных — дзякоў, пісараў, служэбнікаў, а таксама шляхціцаў.

Перадумовамі з'яўлення прафесійнага прадстаўніцтва былі аб'ектыўныя, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя прычыны. Найперш гэта стварэнне Вялікага княства Літоўскага, пераадоленне феадальнай раздробленасці, цэнтралізацыя вялікакняжацкай улады, зараджэнне бюракратыі і новых інстытутаў дзяржаўнага кіравання, у тым ліку і судовых. Умацаванню дзяржаўнасці ВКЛ і яго органаў кіравання, асабліва судовых, адпавядала развіццё права, што выявілася ва ўзнікненні пісанага заканадаўства і яго паступовым ускладненні, паслядоўнай замене норм звычаёвага права палажэннямі пісанага права. Гэта прывяло да таго, што замест некваліфікаваных прадстаўнікоў прыйшлі прафесіяналы, якія ў абавязковым парадку валодалі граматай, патрэбнай каб чытаць законы і складаць позвы, скаргі, весці запісы ў судовых кнігах. Апошняе было асабліва неабходным, улічваючы бюракратызацыю судовага працэсу, які з цягам часу настолькі фармалізаваўся і ўскладніўся, што без спецыяльных прававых ведаў і валодання граматай вельмі цяжка было выступаць у судзе.

Асабліва варта адзначыць сацыяльна-эканамічныя прычыны прафесіяналізацыі прадстаўніцтва. Тэрыторыя ВКЛ паступова павялічвалася, розныя княствы аб'ядноўваліся ў адзіную дзяржаву, адбывалася яднанне іх эканомік, пашыраўся гандаль, што выклікала неабходнасць грамадзянска-прававога (гандлёвага) прадстаўніцтва. Напрыклад, купцы валодалі

маёмасцю ў некалькіх гарадах ВКЛ і вялі гандаль у розных яго землях, таму фізічна не маглі ўдзельнічаць у гаспадарчых спрэчках адначасова ва ўсіх гэтых месцах, менавіта ў такіх выпадках і ўзнікала неабходнасць у паверанных. Можна было мець адразу некалькі паверанных у шматлікіх гарадах, што вызваляла купцоў ад неабходнасці самастойнага ўдзелу і эканоміла іх час і рэсурсы. Тым больш, што не кожная асоба мела здольнасць выступаць у судзе, асабліва пры паступовым ускладненні судаводства. Па-ранейшаму існавала неабходнасць у прадстаўніцтве абмежавана дзеяздольных (жанчын, падлеткаў, хворых і г. д.). Прадстаўніцтва адыгрывала важную ролю ў крымінальным працэсе, бо дазваляла лепш абараніць правы бакоў.

Пісары, дзякі і іншыя як прадстаўнікі ў судзе былі вядомыя ўжо з часоў Вялікага князя Вітаўта [6, *116*]. Найбольш гістарычных сведчанняў захавалася адносна прававой дзейнасці дзякоў, якія выконвалі адну з важнейшых функцый адваката (напісанне судовых пісьмовых дакументаў — скаргаў, хадайніцтваў, іскаў і інш.). Яны аднымі з першых пачалі браць грошы за дапамогу пры вядзенні спраў у судзе, што сведчыць пра пачатак зараджэння прафесійнай адвакацкай дзейнасці. У гістарычных крыніцах з цягам часу дзейнасць дзякоў як пісьменных людзей прывяла да таго, што гэта слова стала сінонімам тэрмінаў «сакратар», «справаводца», што лепшым чынам адлюстроўвала іх асноўную дзейнасць [6, *117*].

З канца 20—30-х гг. XVI ст. складанне судовых дакументаў афіцыйна становіцца адной з асноўных функцый дзякоў. Іх навыкі давалі магчымасць замяшчаць пісараў у час адсутнасці апошніх, гэта значыць фактычна выконваць іх абавязкі. Бывала, што дзякі працавалі і на канкрэтных феадалаў. Шмат хто з іх з цягам часу пачаў займацца адвакацкай дзейнасцю прафесійна. Пазней гэтай справай пачалі займацца і маладыя гаспадарскія дваране, якія праз свае спецыяльныя веды рабілі тым самым пэўную службовую кар'еру [6, *118*].

Амаль адначасова, ў XIV ст., у сувязі з рэцэпцыяй найбольш развітымі і буйнымі беларускімі гарадамі Магдэбургскага права адбываецца станаўленне так званага правазаступніцтва. Вялікае княства Літоўскае з пары свайго заснавання мела пашыраныя сувязі з заходнееўрапейскімі краінамі, асабліва з суседняй Польшчай, гэта вяло не толькі да культурнага і рэлігійнага ўплыву апошняй, але і садзейнічала распаўсюджанню на тэрыторыі ВКЛ заходнееўрапейскай прававой думкі, найперш нямецкага (Магдэбургскага) права. З пачаткам дзеяння пісанага Магдэбургскага права можна казаць аб тым, што на тэрыторыі Беларусі развіццё права паступова набывае заходнееўрапейскія рысы кантынентальна рамана-германскага права, што надзвычай спрыяльна адбіваецца на развіцці працэсуальнага права і інстытута адвакатуры ў прыватнасці. Наяўнасць апошняга храналагічна і змястоўна значна апярэджвала ў той час адпаведныя з'явы ў іншых усходнеславянскіх землях.

Пад *правазаступніцтвам* намі разумеецца якасна новы ўзровень прафесійнага аказання адвакацкіх паслуг, найбольш блізкі да сучаснага паняцця адвакатуры, які характарызуецца з'яўленнем асобага круга прававедаў, не проста прадстаўляўшых свайго кліента шляхам давядзення да ведама суда яго пазіцыі, але і непасрэдна ўплываўшых на зыход справы шляхам уласнага трактавання матэрыялаў справы, доказаў, аналізіі заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі. На наш погляд, правазаступніцтва ёсць найбольш падобная да сучаснага вызначэння адвакатуры форма юрыдычнай дзейнасці. Яго ўзнікненне і развіццё было выклікана паступовымператварэннем судовага прадстаўніцтва ў прафесію і ўскладненнем юрыдычных норм, выкліканым развіццём грамадскіх адносін.

Веданне і ўжыванне норм права рабілася складаным для большасці людзей, якія не валодалі спецыяльнай падрыхтоўкай і былі ўжо не ў сілах самі весці свае справы, таму ім неабходна была дапамога чалавека, добра знаёма-

га з палажэннямі матэрыяльнага права і правіламі працэсу. Актуальнай стала неабходнасць ў спецыялістах, якія б спецыяльна займаліся вывучэннем законаў і маглі аказваць людзям, што маюць у гэтым патрэбу, юрыдычную падтрымку або правазаступніцтва. Гэта і складала змест паняцця, якое цяпер прынята называць адвакацкай дзейнасцю ва ўласным сэнсе слова.

З увядзеннем Магдэбургскага права звязана з'яўленне такога тэрміна, як «пракуратар», якое першапачаткова паходзіць ад нямецкіх Fursprecher і Vorsprecher. Яны ўжываліся ў такіх вядомых помніках нямецкага права, як Landrecht, Weichbild, дзе гэтыя асобы былі ўжо не проста прадстаўнікамі ці паверанымі старон, а менавіта правазаступнікамі (адвакатамі) у прамым сэнсе [1, *207*]. Так, вядомы даследчык гісторыі ВКЛ Ф.В. Тараноўскі адзначаў, што судовыя спрэчкі па Магдэбургскаму праву вяліся ў большасці выпадкаў не самімі бакамі, а іх адвакатамі (пракуратарамі) [11, *44*]. Судовы працэс быў вусны, публічны і спаборны, што прывяло да самага шырокага выкарыстання паслуг пракуратараў, так як яны былі больш дасведчанымі ў галіне права і маглі аказаць істотны ўплыў на вынік справы.

У той жа час выразнага прафесійнага падзелу паміж наёмнымі прадстаўнікамі (дзякі, пісары, служэбнікі) і правазаступнікамі (пракуратары) не было. Спецыялізацыя па прадстаўніцтве і правазаступніцтву была даволі ўмоўнай, часта гэтыя функцыі ажыццяўляліся як першымі, так і другімі асобамі. І усё ж асноўным накірункам дзейнасці першай катэгорыі асоб была іх непасрэдная службовая дзейнасць (царкоўная, адміністрацыйная), і толькі затым прадстаўніцкая як адна з дадатковых функцый да іх асноўнай працы. Для пракуратараў жа правазаступства з'яўлялася асноўнай працай, іх рамяством. Таму найбольшага развіцця адвакатура ў Беларусі дасягнула ў гарадах на падставе Магдэбургскага права ў асобе пракуратараў.

З развіццём статутнага права гэта перавага становіцца ўсё відавочней і прыводзіць да паступовай перавагі адвакатаў у судовым працэсе над прадстаўнікамі. У гэтым не апошнюю ролю адыграла юрыдычная адукацыя, якая ўсё больш распаўсюджвалася сярод беларускіх пракуратараў, спачатку па індывідуальным жаданні, а затым і ў сувязі з патрабаваннямі заканадаўства (у статутны перыяд). Пачынаючы з XVI ст. функцыяніраванне адвакатуры рэгулявалася акрамя палажэнняў Магдэбургскага права таксама і агульнадзяржаўным заканадаўствам (Статутамі ВКЛ).

Са сказанага вынікае, што у дастатутны перыяд працэсуальнаму праву на тэрыторыі Беларусі былі вядомы наступныя формы абаронча-прадстаўніцкай судовай дзейнасці: натуральнае прадстаўніцтва, наёмнае прадстаўніцтва, правазаступніцтва. Апошнія дзве формы датычыліся прафесійнай адвакацкай дзейнасці, што адпавядала працэсуальным нормам такіх заходнееўрапейскіх краін, як Францыя, Англія, Бельгія, Італія і Іспанія, дзе нараўне з класамі непасрэдна адвакатаў-правазаступнікаў (advocat, barriste, avvocato, abogado) дзейнічаў інстытут судовых прадстаўнікоў, якіх называлі паверанымі (avoue, solicitor or attorney). Прадстаўніцтва і правазаступніцтва ў Беларусі былі аб'яднаны ў руках пэўнай грамадскай суполкі толькі ў XIX ст. і атрымалі найменне адвакатаў, як, напрыклад, у Германіі, дзе дзве гэтыя установы былі пераўтвораны ў адну (Rechtsanwalttschaft).

Падкрэслім, што ў дастатутны перыяд адвакатура толькі зараджалася, яна з большага не была арганізацыйна і заканадаўча аформлена. Колькасць адвакатаў была невялікай: за 40—50-я гг. XV ст. вядома прыкладна 12 пісараў, дзякоў за 1471—1515 гг. вядома каля 50, потым іх колькасць змяншаецца да 15 у 1516—1550 гг. [6, *116—118*]. Аб невялікай колькасці пракуратараў сведчыць запіс у Метрыцы ВКЛ ад 28.05. 1529 г. (да прыняцця Статута 1529 г.), які апісвае справу пані Мікалаевай. Апошняя просіць Вялікага князя прызначыць ёй пракуратара «хто бы могъ реч нашу перед вашою милостью, господарем нашимъ оповедати напртивъку земянъ, подданых нашых». На што Князь адказвае: «Якомъ первеи вамъ поведилъ, ижъ

есте хотели мети прокураторомъ собе дворанина нашого пана Непъшьща. Мысмо вамъ того не дозволили для тое прычыны, ижъ мы дворанъ наших ховаемъ на двое нашомъ для нашое господарское потребы, а не для кого иного, бо то не естъ слушъная речъ, абы чыи служебникъ мел напротивъку речы пана своего быти» [12, *114*].

Асноўная маса судовых працэсаў, як грамадзянскіх, так і крымінальных, па-ранейшаму адбывалася з асабістым удзелам, альбо з удзелам натуральных прадстаўнікоў. Толькі ў пазнейшы час колькасць адвакатаў павялічылася на столькі, што большасць спраў разглядалася з іх удзелам, гэтаму садзейнічалі і Статуты ВКЛ, якія, напрыклад, забаранялі самастойны ўдзел жанчын у судзе, таму апошнія былі вымушаныя наймаць сабе пракуратараў.

Тым не менш у дастатутны перыяд інстытут адвакатуры стаў дастаткова важным і напрацаваў столькі працэсуальных юрыдычных набыткаў, што пры прыняцці Статутаў ВКЛ яны браліся пад значную ўвагу і замацоўваліся на заканадаўчым узроўні. Напрыклад, Статут 1529 г. у сваім адзіным артыкуле, прысвечаным адвакатам, забараніў іншаземцам быць пракуратарамі, гэта сведчыць аб важнай для дзяржавы ролі пракуратараў, а таксама аб тым, што, відаць, да прыняцця Статута 1529 г. сярод пракуратараў сустракаліся іншаземцы, што негатыўна ўплывала на дзяржаўнае судаводства, таму і з'явілася такая забарона. Таксама ў дастатутны перыяд было асэнсавана, што адвакаты павінны былі быць досыць адукаванымі і ведаць беларускую мову, што таксама пазней знайшло адлюстраванне ў статутным праве. Частка суддзяў і адвакатаў атрымлівалі адукацыю ў заходнееўрапейскіх універсітэтах, дзе ўжо з сярэдзіны XV ст. расла колькасць кафедраў рымскага права. Рыхтавалі прававыя кадры і юрыдычныя факультэты Польшчы [13, *32—33*]. У Беларусі ў той перыяд пракуратары атрымлівалі прававыя веды ў кальвіністкіх і арыянскіх, а таксама ў прыватных школах (палестрах). Першай жа спецыяльнай юрыдычнай установай у Вялікім княстве Літоўскім стала Святаянская школа грамадзянскага права (1566—1579) [13, *32—33*]. М. Навакоўскі адзначае, што ў Вялікім княстве Літоўскім мелі месца і так званыя аплікаінты — стажоры пры адвакатах [14, *30*].

Што тычыцца сацыяльнага складу адвакатаў, то ў той перыяд адвакатамі маглі быць як асобы прывілеяванага саслоўя (перш за ўсё шляхта), так і свабодныя людзі простага саслоўя, у статутны ж перыяд толькі шляхта магла быць пракуратарамі. З ранніх часоў напісанне судовых дакументаў (скаргі, хадайніцтвы, іскі і інш.) засяроджвалася ў руках духавенства [7, *113*], у першую чаргу дзякаў, хоць сацыяльны статус апошніх мог розніцца. Пракуратарамі з'яўляліся ў асноўным гарадскія жыхары і шляхта. Заробак адвакаты мелі як ад тых устаноў ці паноў, якім яны стала служылі, так і ад асобаў, якія іх наймалі для вядзення справы разава. Прыбытак, відаць, быў значным, бо ў больш позні час вядома нават аб спробах стрымаць развіццё адвакатскай дзейнасці [15]. Грамадзяне разумелі, што ўдзел у судовай справе пракуратара павялічваў шанец на добры сыход справы, таму не шкадавалі на гэта грошай.

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі развіццё судовай прадстаўніцкай функцыі першапачаткова насіла сходны з іншымі усходнеславянскімі народамі характар, а само прадстаўніцтва было натуральным і засноўвалася амаль поўнасцю на звычаёвым праве. З утварэннем Вялікага княства Літоўскага па сацыяльна-эканамічных і палітычных прычынах узнікае наёмнае прадстаўніцтва, якое працягвала рэгулявацца звычаёвым правам, а таксама нешматлікімі пісанымі законамі. Пазней у сувязі з рэцэпцыяй нямецкага (Магдэбургскага) права з'яўляецца прафесійнае правазаступніцтва — правобраз сучаснай адвакатуры. З гэтага перыяду мы можам казаць аб з'яўленні на тэрыторыі Беларусі прафесійнага інстытута адвакатуры, а працэсуальнае права Беларусі набывае ў значнай ступені заходнееўрапейскія рысы і пачынае інтэнсіўна развівацца. Інстытут адвакатуры развіваўся ў двух накірунках — наёмнае прадстаўніцтва і правазаступніцтва,

хоць побач працягвала існаваць натуральнае прадстаўніцтва. На падставе шматкольkаснай судовай практыкі развіццё адвакатуры ішло шпарка, была выпрацавана шматлікая судовая практыка, але належнага арганізацыйнага і заканадаўчага афармлення адвакатуры ў той час зроблена не было, гэта адбылося ўжо ў перыяд прыняцця Статутаў Вялікага княства Літоўскага (1529, 1566, 1588), пры распрацоўцы якіх улічваўся папярэдні прававы досвед, а таксама нормы звычаёвага права.

**Літаратура**


1. *Малышев, К.* Курс гражданского судопроизводства / К. Малышев. — 2-е изд. — СПб., 1876.
2. *Любавский, М.К.* Литовско-русский сейм / М.К. Любавский. — М.: Унив. тип., 1900.
3. *Бородин, Д.Н.* Исторический очерк русской адвокатуры (к 50-летию присяжной адвокатуры) / Д.Н. Бородин. — Петроград, 1915.
4. *Доўнар-Запольскі, М.В.* Асновы дзяржаўнасці Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. — Гродна, 1919.
5. *Доўнар, Ю.П.* Зараджэнне інстытута прафесійнай адвакатуры ў Вялікім княстве Літоўскім / Ю.П. Доўнар // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права. — 2003. — № 1.
6. *Доўнар, Ю.П.* Судовая рэформа XVI стагоддзя ў Вялікім княстве Літоўскім / Ю.П. Доўнар. — Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2007.
7. *Борисенок, С.* Утворення професійноі адвокатурі в Литовсько-руській державі / С. Борисенок // Працы комісіі для вывучэння історіі заходне-русско-украинского права. — Киев, 1927.
8. *Kutzeba, S.* Dawne polskie prawo sądowe / S. Kutzeba. — Lwow, 1927.
9. *Баженова, У.И.* Адвокатура в дореволюционной России (вторая половина XIX — начало XX века): дис ... канд. юрид. наук: 12.00.01 / У.И Баженова. — Н. Новгород, 2002. — 170 л.
10. *Васьковский, Е.В.* Организация адвокатуры: в 2 ч. / Е.В. Васьковский. — СПб., 1893. — Ч. 1: Очерк всеобщей истории адвокатуры.
11. *Тарановский, В.В.* Обзор памятников магдебургского права западно-русских городов литовской эпохи / В.В. Тарановский. — Варшава, 1897.
12. Литовская метрика 15: книга записей (1528—1538).
13. *Сокол, С.Ф.* Политическая и правовая мысль в Беларуси XVI ст. — первой половины XVII ст. / С.Ф. Сокол; под общ. ред. И.А. Юхо. — Минск: Наука и техника, 1984.
14. *Новаковский, М.М.* Очерк судоустройства и гражданского процесса по бывшим Статуту литовскому и конституциям составленный / М.М. Новаковский. — СПб: Гос. Концелярия, 1863.
15. Литовская метрика (1528—1547). 6-я книга судных дел / подгот.: И. Валконите [и др].— Вильнюс, 1995. — № 262, 277, 382, 391 и др.


*Статья поступила*
*в редакцию 01.03. 2012 г.*

**В.Г. ГОВЗИЧ**

## ТЕНДЕНЦИИ В СФЕРЕ ПРАВОВОГО РЕГУЛИРОВАНИЯ ИГОРНОГО БИЗНЕСА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Из всех сфер жизнедеятельности Республики Беларусь наименьшее воздействие финансовый кризис в стране оказал на индустрию игорного бизнеса.

Министерством по налогам и сборам Республики Беларусь были опубликованы статистические данные, из которых следует, что в игорной индустрии зарегистрировано 11 юридических лиц. В настоящее время в Беларуси успешно функционирует 33 казино с популярными играми на

*Валерий Георгиевич ГОВЗИЧ, кандидат юридических наук, доцент кафедры экономики предпринимательства и права Белорусского государственного экономического университета.*

БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by